PATVIRTINTA
Nacionalinio egzaminų centro direktoriaus
2013 m. sausio 18 d. įsakymu Nr. (1.3.)-V1-7

# Gimtosios kalbos (baltarusių) dalies žodžiu (viešojo kalbėjimo) pagrindinio ugdymo pasiekimų patikrinimo vertinimo instrukcija (lentelė)

## I. Першы этап – планаванне выступлення.

На гэтым этапе вучань выбірае / фармулюе тэму, даследуе розныя крыніцы інфармацыі, складае разгорнуты план выступлення са спіскам крыніц інфармацыі, якія ён будзе выкарыстоўваць пры адказе.

| Крытэрыі | Апісанне крытэрыяў | Ацэнка | Балы (3) |
|---|---|---|---|
| **1. Змест** | Дэманструецца ўменне сфармуляваць / выбраць тэму, аформіць магчымыя тэзісы (2–3), абгрунтаваць не менш за 2 аргументы з указаннем крыніц інфармацыі. | Адпавядае крытэрыям | **2** |
| | | Часткова | **1** |
| | | Не | **0** |
| **2. Структура тэксту** | Паказваецца разгорнуты план выступлення. | Так | **1** |
| | | Не | **0** |
| **3. Кантакт з адрасатам** | – | | – |
| **4. Правільнасць і выразнасць мовы** | – | | – |

## II. Другі этап – напісанне тэксту выступлення.

З улікам заўваг настаўніка вучань дапрацоўвае план, вывучае складзены спіс літаратуры, рыхтуе разгорнуты тэкст выступлення. Пры неабходнасці вучань спасылаецца на наглядны матэрыял, які плануе выкарыстаць і які працягвае збіраць, і дае тэкст для праверкі.

| Крытэрыі | Апісанне крытэрыяў | Ацэнка | Балы (8) |
|---|---|---|---|
| **1. Змест** | У тэксце выразна выказаны асноўная думка, тэзісы і аргументы «за» (пры неабходнасці і “супраць”). Выкарыстоўваюцца розныя крыніцы інфармацыі. | Адпавядае крытэрыям | **2** |
| | | Часткова | **1** |
| | | Не | **0** |
| | Дэманструецца ўменне самастойна разважаць, абагульняць / рабіць высновы. | Адпавядае крытэрыям | **2** |
| | | Часткова | **1** |
| | | Не | **0** |
| **2. Структура тэксту** | Прысутнічаюць усе структурныя часткі (уступ, асноўная частка, заключэнне), вытрыманы іх прапорцыі. Удала выкарыстоўваюцца цытаты / прыклады і сродкі сувязі. Структура сказаў успрымаецца на слых. | Адпавядае крытэрыям | **2** |
| | | Часткова | **1** |
| | | Не | **0** |
| **3. Кантакт з адрасатам** | Дэманструецца ўменне карыстацца рытарычнымі стратэгіямі / зацікавіць адрасата (арыгінальны пачатак, самы важкі аргумент ў канцы выступлення, кантраст, цытаты, крылатыя выразы, рытарычныя пытанні і г.д.). | Адпавядае крытэрыям | **1** |
| | | Не | **0** |
| **4. Правільнасць і выразнасць мовы** | Мова граматная, адпавядае нормам літаратурнай мовы. | Адпавядае крытэрыям | **1** |
| | | Не | **0** |

### III. Трэці этап – выступленне.

Азнаёміўшыся з каментарыямі настаўніка, вучань удасканальвае выступленне, завучвае яго і прамаўляе.

| **Крытэрыі** | **Апісанне крытэрыяў** | **Ацэнка** | **Балы (9)** |
|---|---|---|---|
| **1. Змест** | Дэманструецца ўменне выказаць свае адносіны да прадмету выступлення і пры неабходнасці карыстацца наглядным матэрыялам. | Адпавядае крытэрыям | **2** |
| | | Часткова | **1** |
| | | Не | **0** |
| | Мова лагічная, паслядоўная, выкарыстоўваюцца сродкі для структурызацыі тэксту: па-першае і інш. | Адпавядае крытэрыям | **1** |
| | | Не | **0** |
| **2. Структура тэксту** | Дэманструецца ўменне ўстанавіць зрокавы кантакт з адрасатам і імкненне яго зацікавіць. Жэсты і міміка адпавядаюць камунікатыўнай сітуацыі. | Адпавядае крытэрыям | **2** |
| | | Часткова | **1** |
| | | Не | **0** |
| **3. Кантакт з адрасатам** | У мо е в амаль адсутнічаюць лексічныя, граматычныя, стылістычныя і арфаэпічныя памылкі. | Адпавядае крытэрыям | **2** |
| | | Часткова | **1** |
| | | Не | **0** |
| **4. Правільнасць і выразнасць мовы** | Мова багатая і выразная, удала ўжываюцца выяўленчыя сродкі мовы, сінонімы, антонімы і інш. | Адпавядае крытэрыям | **2** |
| | | Часткова | **1** |
| | | Не | **0** |